УДК 821.161.3-3.09

Іншанацыянальная рэчаіснасць у творчасці сучасных беларускіх празаікаў

Бароўка В.Ю.
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск

У артыкуле даследуецца мастацкае асэнсаванне іншанацыянальнай рэчаіснасці ў сучаснай беларускай прозе на матэрыяле рамана "Уліс з Прускі" У. Гніламёдава і аповесці "Каменданцкі час для ластавак" А. Брава. Сцвярджаецца, што ўзнаўленне іншанацыянальных рэалій і характараў галоўным чынам дэтэрмінуецца пісьменніцкай індывідуальнасцю. Адзначаецца: паказ іншанацыянальнай рэчаіснасці грунтуецца на шырокім выкарыстанні мастацкага этнаграфізму. Заўважаецца, што сучасныя аўтары аддаюць перавагу выкарыстанню асіметрычнага этнатопу, а кампазіцыя твораў асноўваецца на пастаянным супастаўленні "свайго" і "чужога". Робіцца вывад: адлюстраванне "чужога" падначальваецца не толькі выяўленню этнаментальнага, але і асэнсаванню анталагічнай праблематыкі і акцэнтацыі сувязі нацыянальнага і агульначалавечага.
Ключавыя словы: *беларуская проза, імагалогія, этнатоп, жанр, кампазіцыя, праблематыка.*

(Ученые записки. – 2012. – Том 13. – С. 119–125)

The validity of foreign nationalities reality in the works of modern Belarusian writers

Barouka V.Yu
Educational establishment "Vitebsk State University named after P.M. Masherov", Vitebsk

In the article art conceptualization of foreign national reality in Belarusian modern prose is under investigation on the basis on the novel "Ulisses from Pruska" by U. Gnilomedov and the novel "The curfew for Swallows" by A. Bravo. It is emphasized, that the image of other nationalities and realities of the characters is determined by the writer's individuality. It is stressed that illustration of foreign national reality is based on the extensive use of art ethnographism. It is noted, that modern authors prefer to use asymmetric ethnotop, that the composition of works is based on the constant comparison of "one's own and others". It is concluded, that the image of "other" is not subjected to finding out the ethnomomental but to understanding ontological perspective and accenting the link between the national and the universal.
Key words: *Belarusian prose, imagology, etnothop, genre, composition, problem area.*

(Scientific notes. – 2012. – Vol. 13. – P. 119–125)

В а ўмовах інтэнсіўных глабалізацыйных рухаў адным з перспектыўных напрамкаў літаратуразнаўчых даследаванняў становіцца вывучэнне дынамікі, прыёмаў і сродкаў рэпрэзен-тацыі іншанацыянальнай рэчаіснасці ў слоўным мастацтве. Сведчанне таму – працы заходніх вучоных другой паловы XX стагоддзя, найперш нямецкіх, чэшскіх і славацкіх, а таксама сучасных расійскіх літаратуразнаўцаў. Такога роду даследаванні дазваляюць больш паглыблена выявіць тыпалагічныя асаблівасці і спецыфіку эстэтычнай ідэнтыфікацыі канкрэтнай нацыянальнай літаратуры, акцэнтаваць увагу на значнасці камунікатыўнага плана літаратурных твораў. Асэнсаванне праблем імагалогіі ў айчынным літаратуразнаўстве пакуль яшчэ знаходзіцца ў працэсе станаўлення.

Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: dvkessibar@mail.ru – **В.Ю. Бароўка**

Мэта дадзенай работы – выяўленне накіраванасці, прыёмаў і сродкаў мастацкага ўвасаблення іншанацыянальнай рэчаіснасці ў творчасці беларускіх празаікаў пачатку XXI стагоддзя.

Матэрыял і метады. Аб'ектам даследавання ў артыкуле сталі раман "Уліс з Прускі" Уладзіміра Гніламёдава і аповесць "Каменданцкі час для ластавак" Алены Брава як найбольш рэпрэзентатыўныя з пункту гледжання ўвасаблення іншанацыянальнай рэчаіснасці ў творы. Абодва яны заснаваны на своеасаблівым дакументальным матэрыяле (галоўныя героі іх маюць рэальных прататыпаў), на мастацкім абагульненні жыццёвых фактаў. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, фена-меналагічнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў, якія дазваляюць усебакова ахарактарызаваць літаратурныя творы.

Вынікі і іх абмеркаванне. Тэматычны дыяпазон сучаснай беларускай прозы дастаткова шырокі, у сферу эстэтычнага пазнання пісьменнікаў трапляюць не толькі беларускія, але і іншанацыянальныя рэаліі. Раман "Уліс з Прускі" У. Гніламёдава і аповесць "Каменданцкі час для ластавак" А. Брава – творы, у якіх расказваецца пра знаходжанне беларусаў у далёкім замежжы. Спасціжэнне "свайго" праз паказ "чужога" – распаўсюджаны прыём у мастацкай практыцы сусветнай літаратуры. У рускай класіцы XIX стагоддзя, напрыклад, характар рускага чалавека нярэдка адцяняўся нямецкім, англійскім ці французскім, радзей, як у рамане І.С. Тургенева "Напярэдадні", – балгарскім. Традыцыі эстэтычнага асэнсавання іншанацыянальных рэалій і характараў у беларускай прозе закладваліся на пачатку XX стагоддзя ў творчасці Цёткі, Вацлава Ластоўскага, Максіма Гарэцкага. Асваенне іншанацыянальнага свету беларускімі аўтарамі мінулага стагоддзя ўяўляла сабой не лінейны, а дыскрэтны працэс. Цікавасць да ўвасаблення іншанацыянальных рэалій, як правіла, узрастала ў так званыя пераходныя перыяды (на пачатку стагоддзя, у 1920-я гады, у канцы 1950 – пачатку 1960-х гг., у канцы мінулага стагоддзя). Сацыякультурная сітуацыя пачатку трэцяга тысячагоддзя спрыяе далейшаму эстэтычнаму асваенню беларускімі аўтарамі іншанацыянальных рэалій.

Сюжэт абодвух твораў пабудаваны на матывах падарожжа і вяртання на радзіму. Асаблівасці абранага пісьменнікамі жанру істотна ўплываюць на рэпрэзентацыю іншанацыянальных рэалій. "Уліс з Прускі" У. Гніламёдава – раман. Назва твора ўтрымлівае ў сабе пэўны мастацкі код, указвае на творчую рэалізацыю матыву падарожжа, на наследаванне літаратурнай традыцыі, выпрацаванай яшчэ ў антычнасці. Жанр рамана абавязвае пісьменніка да шырокага ахопу рэчаіснасці, шматтэмнасці, шматсюжэтнасці. "Каменданцкі час для ластавак" А. Брава – аповесць, у назве якой закладзены аксюмаран. Аповесць як жанр патрабуе апісальнасці, адной разгалінаванай сюжэтнай лініі. Героі абодвух твораў – маладыя беларусы, якія ў пошуках долі і шчасця апынуліся за акіянам: гніламёдаўскі Лявон Кужаль – у Злучаных Штатах на пачатку XX стагоддзя, а Алеся ў Алены Брава – на Кубе ў канцы мінулага стагоддзя. Алеся з больш матэрыяльна ўладкаванага жыцця трапляе ў менш матэрыяльна ўладкава-нае, а Лявон – наадварот.

Мастацкае асваенне іншанацыянальных рэалій у літаратуры – працэс складаны. Вядомы навукоўца Ю.М. Лотман адносна гэтага працэсу заўважыў, што культура ўласнымі намаганнямі стварае "носьбіта іншай свядомасці, які інакш кадзіруе свет і тэксты. Гэты ствараемы ў нетрах культуры – у асноўным па кантрасце з ўласнымі дамінантнымі кодамі – вобраз экстэрыярызуецца і праецыруецца на ўсе яе прылягаючыя

светы” [1, с. 117], аднак разам з тым, “каб мець зносіны са знешняй культурай, культура павінна інтэрыярызаваць яе вобраз у свой унутраны свет” [1, с. 117]. Такі працэс непазбежна складаны, супярэчлівы, таму што “ўнутраны вобраз знешняй культуры валодае мовай зносін з культурным светам”, у які гэты вобраз уключаны, гэта таксама “звязана са стратамі пэўных і часта найбольш каштоўных як стымулятары якасцей аб’екта, што канструюецца” [1, с. 117]. Феномен прадстаўленых пісьменнікамі іншана-цыянальных рэалій абумоўлены складанасцю спасцігаемых з’яў, канцэптуальнасцю мастацкага адлюстравання.

Раман “Уліс з Прускі” мае дынамічны сюжэт, герой твора – дзейсны малады чалавек, які ў пошуках працы перамяшчаецца па тэрыторыі Амерыкі. Лявон з’явіўся за акіянам у няпросты час: “Крызіс 1907 года ў Амерыцы ўзмацніў беспрацоўе і голад” [2, с. 228]. Сюжэтная лінія дапамагла пісьменніку паказаць розныя куткі чужой краіны, пазнаёміць з норавамі і звычкамі гараджан і вяскоўцаў, рабочых і фермераў. Вясковага хлопца Лявона Кужаля і яго спадарожнікаў-беларусаў уразілі Нью-Йорк, статуя Свабоды. Першая сустрэча была эмацыянальна ўзрушанай: “Нью-Йорк, па меры набліжэння, рос, шырыўся на вачах, прамавугольнікі ператвараліся ў высотныя хмарачосы. Увайшлі ў порт, які здзівіў мітуснёю і няўрымслівасцю сваіх працоўных рытмаў: вылі сірэны, грымелі якарныя ланцугі, сюды-туды снавалі катэры” [2, с. 222]. Беларускіх хлопцаў з глыбінкі спачатку знешне ўразілі амерыканцы: “Абліччы людзей, якія траплялі ім насустрач, дыхалі энергіяй і бадзёрасцю” [2, с. 225]; “Прускаўцы пачувалі сябе так, нібы трапілі ў нейкія вялікія жорны, і ходу назад няма” [2, с. 225]. Рытм замежнага гарадскога жыцця істотна розніўся ад рытму ранейшага існавання герояў: “Жыццё на нью-йоркскіх вуліцах віравала і пенілася. Крычалі прадаўцы газет. Праносіліся аўтамабілі. Паўсюль валялася шмат рознага смецця. Там-сям проста на тратуары сядзелі негры са шчоткамі ў руках. Размахваючы гэтымі шчоткамі, яны прапаноўвалі прахожым свае паслугі – пачысціць чаравікі” [2, с. 226]. Амерыка нагадвала Лявону, прататыпам якога быў дзед пісьменніка, вялікі плавільны кацёл: “Параўноўваў жыццё на радзіме з жыццём у Амерыцы. Вялікая розніца. Амерыка здзівіла, скаланула душу. Народу – процьма! Сустрэнеш – каго хочаш: англічан, немцаў, грэкаў, туркаў, палякаў, рускіх, галандцаў, італьянцаў... Асабліва шмат ірландцаў. Жыццё не спыняецца ні ў дзень, ні ў ночы – бурліць і бурліць. На сценах і дахах дамоў зырка гараць літары электрычных рэклам, нагадваючы тыя гіганцкія вогненыя надпісы, што з’явіліся перад біблейскім Валтасарам” [2, с. 315].

На чужыне Лявон вымушаны быў засвойваць новыя правілы паводзін, адно з іх – заўсёды ўсміхацца, нават калі на душы зусім нявесела, бо “тут і сапраўды больш за ўсё цанілі вясёлы нораў і незалежнасць” [2, с. 228]. Другое правіла заключалася ў тым, што чалавек павінен знешне добра выглядаць. Першая праца ў Лявона – мыццё вокнаў, да якой ён паставіўся непрыязна, бо на радзіме гэта – жаночая справа: “Гарадская праца супраць ранейшай, прускаўскай <…>, здавалася вельмі нязвыклай, нават дзіўнай” [2, с. 232]. Потым Лявон стаў у Нью-Йорку ліфцёрам, апальшчыкам у кацельнай і адзначыў для сябе, што амерыканцы з павагай адносяцца да стомленага працай чалавека: “у электрычцы, калі вяртаўся з работы, яму амаль заўсёды саступалі месца, нават прыязна ўсміхаючыся” [2, с. 239]. Вясковец Лявон хацеў пазнаёміцца з жыццём фермераў, праз біржу ён трапіў у штат Ілінойс. Аўтар як бы паміж іншым заўважыў: “Сярэдні Захад – ураджайная зямля. Прастора для фермерства. Карэннае насельніцтва адступіла пад націскам прышлых, якія засялялі і абжывалі тэрыторыі гэтага краю. Прабіваючыся на захад, яны асвойвалі цаліну, аралі

плугамі прэрыі, будавалі жыллё. Слабыя выбывалі са строю, не вытрымліваючы суровых умоў жыцця, неўраджаяў, непасільнай працы. Тыя, хто выжываў, заставаўся, былі моцным, учэпістым людам, здольным пастаяць за сябе ў любых жыццёвых акалічнасцях" [2, с. 248]. Гаспадаром фермы аказаўся ўкраінец Грынь Бузук. Гэты чалавек яшчэ памятаў свае "карані", але ўжо адчуваў сябе сапраўдным амерыканцам, з гонарам гаварыў: "Мы, амерыканцы, не любім хадзіць у статку. Кожны – асобна" [2, с. 253]. У апісанні нораваў амерыканцаў, як карэнных, так і прыезджых, апавядальнікам з латэнтнай дыдактычнасцю акцэнтавалася іх імкненне да свабоды. Жыццё правінцыйнай Амерыкі было больш спакойным, у Ілінойсе Лявон са здзіўленнем адзначыў, што "царква з'яўлялася тут асяродкам не толькі рэлігійнага, але і свецкага, а таксама сямейнага жыцця, і гэтым адрознівалася ад прускаўскай, якая да свецкага, тым больш сямейнага ўзроўню не апускалася" [2, с. 269].

Лёс пастаянна выпрабоўваў характар Лявона на трываласць, асабліва тады, калі герой стаў рыбачыць на Вялікіх Азёрах, працаваць у ліцейным цаху на заводзе Форда. У Дэтройце Лявон зразумеў, што эмігрант – чалавек другога гатунку, бо за "пякельную" працу яму плацілі намнога менш, чым карэннаму амерыканцу. Знаходжанне ў Амерыцы для Кужаля – адкрыццё іншага свету: тэхнікі, забаў (у творы падрабязна апісваецца Коні-Айленд – Востраў Забаў у Нью-Йорку, згадваецца пра наведванне кінатэатра) і знясільваючай працы дзеля таго, каб выжыць, каб дасягнуць матэрыяльнага дабрабыту. Параўнанне бытавых умоў існавання беларусаў і амерыканцаў на пачатку мінулага стагоддзя прыводзіла да вываду пра тое, што прастор для асабістай ініцыятывы чалавека ідзе на карысць грамадству. Аднак апавядальнік і герой не ідэалізавалі Амерыку. Пра гэта сведчыць паказ узаемаадносін паміж белымі і чорнымі насельнікамі краіны, трагічная гісторыя негра Букера Вашынгтона, лёс некаторых эмігрантаў. Лявон і яго землякі падсвядома параўноўвалі амерыканскі свет са сваім, прускаўскім. Ва ўспрыманні Лявона Амерыка – краіна вялікіх магчымасцей, але дасягненне іх патрабуе ад чалавека вялікіх фізічных і маральных высілкаў. Жаданне амерыканцаў любой цаной ва ўсім быць першымі і лепшымі не зусім адпавядала этычнаму кодэксу маладога беларуса. Праблемы сэнсу жыцця, свабоды і яе меж раскрываліся праз увасабленне амерыканскіх рэалій і лёсу эмігрантаў. Патрыятычна-настальгічныя матывы ў рамане адцянялі імкненне нашых суайчыннікаў стаць упоравень з іншымі народамі свету. Знаходжанне на чужыне – своеасаблівая ініцыяцыя героя. Лявон вяртаецца на радзіму пасталелым чалавекам: "Розныя моманты давялося перажыць, нават і вельмі цяжкія, усяго паспытаць, але, можа самае галоўнае – яму ўдалося глытнуць і адчуць смак свабоды" [2, с. 280]. Паказ іншанацыянальных рэалій у рамане "Уліс з Прускі" падначальваўся ідэі пра ўзаемасувязь агульначалавечага і нацыянальнага.

Раман У. Гніламёдава напоўнены этнаграфічна-бытавымі падрабязнасцямі, лаканічнымі гістарычнымі каментарыямі. Бытавыя падрабязнасці ў рамане падаюцца вачамі беларусаў-эмігрантаў, а гістарычны фон – звычайна самім апавядальнікам. Дзеля тыпізацыі абставін аўтар матывавана уводзіў англіцызмы. Мастацкі этнаграфізм у рамане стаў важным сродкам эстэтычнай рэпрэзентацыі іншанацыянальных рэалій.

Адметнасць арганізацыі аповеду ў творы А. Брава, падзеі якога прымеркаваны да канца 1980 – пачатку 1990-х гадоў, заключаецца ў тым, што гераіня-апавядальнік Алеся ўспамінае пра сваё непрацяглае знаходжанне на Кубе. Суб'ектывізацыя аўтарам працэсу расказвання актывізуе чытацкае ўспрыманне твора, артыкулюе індывідуальна-апавядальніцкае

бачанне падзей і з'яў. Маладая беларуская жанчына пастаянна, нават міма ўласнай волі, параўноўвае свае і кубінскія рэаліі. Дом, у якім Алеся жыла на Кубе, нагадваў ластаўчына гняздо ("лепіцца дахам да балкона іншага будынка, а з усіх трох бакоў заціснуты паміж мужчынскай цырульняй, фотасалонам ды нейкім складам" [3, с. 7–8]) і правакаваў успаміны пра Беларусь: "На маёй радзіме прастору крояць размашыста і няскупа, з велічэзнымі прыпускамі на швы, а будынкі не налазяць адзін на другі, нібы дэкарацыі з пап'е-машэ ў правінцыйным тэатры" [3, с. 8–9]. Парадаксальнасць суадносін быту і быцця – важная лінія асэнсавання іншанацыянальнага свету і характараў у гэтай аповесці. Атачэнне гераіні, асобы рэфлектыўнай, але творчай, інтэлектуальна развітай, абмежавана галоўным чынам сям'ёй і сяброўкамі па долі. Адчуванне жыццёвага тупіка прымушае Алесю пераацаніць ранейшыя уяўленні пра жыццё на радзіме. З іроніяй Алеся ўспамінае: "Тады, у васьмідзесятыя, мы мелі звычку, досыць беспадстаўную, як высветлілася, кідаць, не задумваючыся: "У нашых крамах нічога няма", – нам і прымроіцца не магло, што ёсць краіна, дзе гэтую метафару трэба разумець літаральна. Ну, хіба можна назваць крамай месца, дзе пасярод мармуровага (а то ж! Тыя, хто будаваў на пачатку стагоддзя, разлічвалі на іншае) прылаўка, быццам тая біблейская авечка, што адбілася ад статка, самотна пасвілася талерка з брутальнае гліны ды на драцяных "плечыках" боўталася нейкая адзежына? Урэшце, прадуктовыя крамы ўражвалі яшчэ мацней: на паліцах стаялі – па картках дзецям! – адно бляшанкі савецкай згушчонкі. Прадаўшчыцы спакойна спалі, уладкаваўшыся ў куточку: скрасці ўсё роўна не было чаго. Па любую драбязу – ад шнуркоў да пялюшак – адразу выстройваліся кіламетровыя чэргі" [3, с. 14]. На Кубе яна ніяк не магла зразумець, "чаму ў бананава-цукрова-кававым раі апельсіны атрымліваюць толькі цяжкахворыя, кава і цукар – толькі па тархетах (прадуктовых картках. – *В.Б.)*" [3, с. 11].

Падрабязна ў аповесці паказваюцца паўсядзённыя клопаты жанчын з вострава Свабоды: "Феліпа ўваходзіць у дом са сваёй палатнянай сумкай, – з пяці гадзін штоpанку яна выпраўляецца ў прадуктовыя чэргі, інакш тут не прыдбаеш нават жменькі сухога гароху, з якога мы гатуем суп-чычара. Свякроўка аднак заўсёды выглядае вясёлай; нешта спяваючы, яна выкладае на стол наш тыднёвы мандада: прадукты і тавары першай неабходнасці, якія адпускаюцца па тархеце, гэта значыць, картцы (картка тут – асноўны дакумент, без яе проста аддасі Богу душу з голаду): адну лібру рысу, невялічкія пакункі з чорнай фасоляй, пачак цыгарэт, трошкі цукру, трошкі кавы..." [3, с. 10]. Бытавыя праблемы ўспрымаюцца карэнным насельніцтвам як норма. Феліпа даводзіць нявестцы: "У цяжкі для Рэвалюцыі час трэба ўмець абыходзіцца найменшым. Ёсць у цябе сёння талерка рысу – добра, няма – таксама добра. Усё астатняе – мяса, масла, яйкі – гэта буржуазная раскоша. Камандантэ заклікае зацягнуць рамяні на апошнюю дзірку – і кожны кубінец павінен гэта зрабіць" [3, с. 27], бо "рэвалюцыянер павінен трываць цяжкасці" [3, с. 27]. А цяжкасцей, сапраўды, многа. Алеся з абурэннем расказвала суайчыннікі: "Сёння Феліпа вымыла падлогу і, апаласнуўшы трохі таз, збіралася памыць у ім Карыну (унучку Феліпы. – *В.Б.)*. Я залямантавала, дык яна з нейкім нават, ведаеш, гонарам адказала: "У маім доме таз усяго адзін!". Ён сапраўды адзін, іржавы, з пазаклейванымі дзіркамі. Пытаюся: "Чаму новы не купіце?". Аказваецца апошнія трыццаць гадоў, гэта значыць пасля перамогі іхняй рэвалюцыі, тазы ў продаж не паступалі" [3, с. 21]. Алеся ментальна не можа зразумець сувязь паміж бытам і светаадчуваннем кубінцаў: "Ніякіх

уцёкаў ад жыцця! Наадварот – суцэльная ад яго асалода. Іх цалкам задавальняе тое, што ёсць, яны нічога лепшага не жадаюць ("Вы, савецкія, хочаце жыць лепш, а гэта ганебна! – пяць балаў Феліпа!): не рамантуюць сваё жытло, не спрабуюць пазбавіцца ад пацукоў і прусакоў. Яны кладуцца спаць галоднымі, але вясёлымі. Яны не памятаюць мінулага, не баяцца будучага" [3, с. 35]. Як бы паміж іншым згадваецца гісторыя пра кубінку, што выйшла замуж за немца, але хутка развялася і вярнулася дадому, бо яе, свабодную жанчыну, муж у Германіі прымушаў мыць падлогу. Самае незразумелае для нашай суайчыннікі заключаецца ў тым, што градус патрыятычных пачуццяў кубінцаў "расце адваротна прапарцыянальна зніжэнню карткавых нормаў" [3, с. 11].

Алесю і многіх яе зямлячак, якія спадзяваліся на новым месцы знайсці шчасце, востраў Свабоды літаральна шакіраваў бытавой неўладкаванасцю, поўнай свабодай у сферы асабістых узаемаадносін паміж мужчынамі і жанчынамі і жорсткай запраграмаванасцю грамадскага жыцця. Гледзячы на акаляючы свет, апавядальніца з сумам канстатавала: "Свабода... Пэўна яе дамагаюцца дзеля адзінай мэты: адразу ж апынуцца ў палоне новай залежнасці" [3, с. 17]. Разам з тым апавядальніца адзначала аптымізм і жыццярадаснасць кубінцаў, іх дружалюбнасць, бескарыслівасць. Яе прыемна ўразіла тое, што на Кубе не прынята адмаўляцца ад дзяцей, што там няма дамоў-малышовак, што там выдатная медыцына.

Калі пасля вяртання на Беларусь Алеся прачытала ў кубінскай газеце пра шыкоўныя курортныя мясціны на востраве, дзе можна добра адпачыць, то з сарказмам прыгадала анекдот пра жыхара рая, які адправіўся турыстам у пекла і ўбачыў там шчаслівых і вясёлых людзей, а пасля папрасіўся туды ў Бога на пастаяннае месца жыхарства: "Не паспеў прыехаць, як чэрці яго пад пахі, і – на патэльню. Мужчына той да Бога лямантаваць: як так, я ж зусім іншае бачыў. А Гасподзь яму ў адказ: турыстычнае падарожжа, даражэнькі, гэта адна справа, а эміграцыя – зусім іншая" [3, с. 90]. Знаходжанне за межамі радзімы дапамагло гераіні лепш зразумець сябе, сваіх суайчыннікаў, адчуць адказнасць за будучыню дачкі. Кампаратыўнае апісанне побыту, нораваў, звычак, светаадчування кубінцаў і беларусаў раскрывала, у аўтарскай інтэрпрэтацыі, нацыянальныя нюансы ў разуменні сэнсу жыцця, шчасця, свабоды.

Заключэнне. Узнаўленне іншанацыянальных рэалій і характараў у творах сучаснай беларускай прозы галоўным чынам дэтэрмінуецца пісьменніцкай індывідуальнасцю. Іх паказ грунтуецца на шырокім выкарыстанні мастацкага этнаграфізму, сучасныя аўтары аддаюць перавагу выбару асіметрычнага этнатопу, у якасці кампазіцыйных прыёмаў ужываюць супастаўленне "свайго" і "чужога", уключэнне іншамоўнай лексікі, акцэнтуюць увагу на перадачы ментальнасці, камунікатыўных паводзін людзей. Адлюстраванне іншанацыяналь-нага свету ў творах сучаснай беларускай прозы падначальваецца не столькі выяўленню этнаментальнага, колькі асэнсаванню анталагічнай праблематыкі і артыкуляцыі сувязі нацыянальнага і агульначалавечага.

Літаратура

1. Лотман, Ю.М. Избранные статьи: в 3 т. / Ю.М. Лотман. – Таллинн: Александра, 1992–1993. – Т. 1. – 1992. – 480 с.
2. Гніламёдаў, У. Уліс з Прускі: раман / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 382 с.
3. Брава, А. Каменданцкі час для ластавак: аповесці, апавяданні / А. Брава. – Мінск: Маст. літ., 2004. – 183 с.

Паступіў у рэдакцыю 9.02.2012 г.

Прыняты ў друк 25.06.2012 г.